# ВАЕННАЕ ЛІХАЛЕЦЦЕ ВАЧЫМА АЛЕНЫ ЦІВУНЧЫК

Калі ў Цецяроўку ўвайшлі немцы, Алене Аляксееўне Цівунчык ішоў дванаццаты год. Яна і цяпер, калі ўспомніць тое ліхалецце, усякі раз зажаліцца.

– Не было тады, мусіць, ніводнай хаты, у якую не зазірнула б гора, – уздыхае. – Нацярпеліся і мы ў сваёй вёсцы. Страшную трагедыю перажылі ў вайну нашы суседзі, ды і мы на валаску ад смерці былі, і не толькі мы. Але ўсё па парадку. Буду расказваць так, як помню, можа і зблытаюся дзе, то прабачайце, бо старая ўжо, ды і сем дзясяткаў гадкоў з той пары прайшло.

Пачну з даваеннага, яшчэ польскага часу. На хутарах тады жылі – чула ад бацькоў – былыя польскія жаўнеры, ці, як пра іх казалі, асаднікі, якіх Пілсудскі надзяліў зямлёй ва "ўсходніх крэсах". Быў такі хутар і каля Цецяроўкі. А мы, дзеці і падлеткі, пасвілі непадалёку ад яго свае каровы. У асадніка расла маліна, ды такая ўжо ўрадлівая, такая салодкая! Хлопцы цішком лазілі ў тую маліну, ласаваліся самі і частавалі астатніх. Асаднік пачаў пільнаваць, наравіў злавіць катарага і прыгражаў, што заб'е да смерці. Самым рызыкоўным сярод нас быў мой сусед цераз дарогу Сяргей Баўблей. Хлопец, дарэчы, добры, цікаўны і кемлівы, завадатар усіх нашых гульняў і спраў. Меў у тую пару гадоў пятнаццаць, а мо і болей. Якраз Сяргея надта ж і не ўзлюбіў той хутаранін. «Пачакай, я ж табе адпомшчу!» — крычаў. І што вы думаеце? Адпомсціў…



*А.А.Цівунчык.*

Калі пачалася вайна, то гэта такі жах быў, што не расказаць вам. Помню, у першы дзень яе, у нядзельку, мы, як заўсёды, пасвілі сваіх кароў. Раптам чуем: дзесьці каля Кватараў штось так цяжка бухае, што аж зямля дрыжыць. Каля Паўлюшак была высокая і крутая гара Круціха. Бачым, як з-за той Круціхі вынырне самалёт і развернецца – і зноў у тым баку цяжка вухкае, а ў неба ўздымаецца чорны дым. Спалохаліся мы. "Кідайма каровы і бяжым дахаты!" – скамандаваў усім

Сяргей. Я яшчэ да свайго сяла не дабегла, як, бачу, тата насустрач бяжыць і крычыць: “Гэта Кватарскі аэрадром бамбяць!”. Аказваецца, ён ужо ведаў, што немец пайшоў вайною.

А бяда з Сяргеем здарылася восенню, калі ўжо бульбу выбіралі. Мы працягвалі пасвіць кожны сваю кароўку, ладзілі розныя гульні. А калі ў небе паказваўся нямецкі самалёт і ляцеў так нізка, што мы бачылі, якія ў яго на крылах крыжы, то адразу стараліся схавацца за крушню ці хоць за карову. Адзін Сяргей толькі не хаваўся і казаў, што варта было б збіць каторага. Мы смяяліся: “Чым збіць, кіем?”

Аднойчы раніцай я прачнулася ад устрывожанага бацькавага голасу. Ён стаяў каля акна і казаў маме, што немцы акружылі хату Баўблеяў. Мама жахліва хрысцілася. Мы ўжо снедалі, а бацькі ўсё працягвалі разважаць над тым, што ж гэта трэба немцам ад нашых суседзяў. Аднак хутка ўсё высветлілася. Мы ўбачылі, што адзін з немцаў ідзе да нашай хаты. Пераступіўшы цераз парог, ён наставіў на мяне аўтамат і загадаў ісці за ім. Нават сёння не магу без слёз успамінаць, што ўбачыла ў хаце Баўблеяў. Сяргей ляжаў на лаве голы, а яго білі кіямі. На хлопцы жывога ўжо месца не было: калі страціць прытомнасць, то на яго выльюць вядро вады і зноў б’юць. Мо раз дзесяць гэтак адлівалі. Маці Сяргея, цётка Волька, галасіла на ўсю хату. Немцы пачалі пытацца ў мяне – нейкі чалавек пераводзіў іх словы – дзе патроны, што Сяргей і я збіралі на выгане, і з чаго страляў ён па нямецкіх самалётах. Я аслупянела, матала галавою: маўляў, нічога не збірала і нічога не бачыла. Немцы махалі перада мной кійком і пагражалі замест Сяргея пакласці на тую лаву мяне. У хату прыводзілі астатніх хлопцаў і дзяўчат з нашай кампаніі і дапытвалі кожнага. Але чамусьці найбольш сурова размаўлялі са мной. Помню, як Валодзя Варапай уступіўся за мяне, сказаў, што я сапраўды ні пры чым, бо ў тыя дні, пра якія пытаюццца, не пасвіла сваю карову. Немцы ўсё больш раз’юшваліся. “Яны заб’юць хлопца!” – крычала цётка Волька і то прасіла немцаў зміласцівіцца, то кідалася да дзядзькі Паўла, каб неяк адвёў ад сына бяду. Я бачыла, як дзядзька Павел выйшаў з хаты. А вярнуўшыся, паставіў на падлогу балейку. У ёй ляжалі нейкія жалязякі. Я не разумела, што гэта, і толькі потым мне сказалі: у балейцы быў разабраны аўтамат.

Мяне адпусцілі. Уся мая сям’я ў хаце не знаходзіла сабе месца, і як толькі пераступіла парог – маці кінулася мяне цалаваць. А бацька загадаў: “Усё, збірайцеся бульбу капаць! Паедзем на поле пад лесам – далей ад немцаў і ад бяды!”

Вярнуўшыся дахаты, мы даведаліся, што Сяргея, яго бацьку і хлопца з вёскі Івана Паўшка ( я не ведаю, за што ён пацярпеў) завезлі

пад Ваўкавыск і там, у Казіных гарах, расстралялі… Усе тады казалі, што на Сяргея немцам данёс той асаднік.

Дзіцячая памяць учэпістая. Цяпер, калі начамі не спіцца, то многае ўспамінаецца. Помню, жыта мы жалі. Толькі паабедалі і зноў узяліся за сярпы, як з жыта вылезлі трое дзядзькоў. “Дайце што-кольвек паесці, – просяць. – Мы партызаны.” Маці божыцца: ”Усё, што мелі з сабою, самі з’елі”. “Мо хоць акрайчык хлеба застаўся?”, – не адстаюць. Я памкнулася напомніць маме, што якраз акрайчык у нас і застаўся. Але яна так грозна глянула на мяне, што словы застраглі ў роце.

Увечары, чую, мама кажа тату: ”Пайду заўтра ў камендатуру і здам немцам тых “партызанаў”. Хоць і вусы прыклеілі, але я іх паліцэйскія морды пазнала адразу. Вярнуўшыся, расказвала, што тых самых “партызанаў”, толькі ўжо бязвусых, каля камендатуры сустрэла. “Ох і рагаталі яны з мяне! – казала.– А калі б пакарміла ўчора – расстралялі б усю сям’ю.”

Многае ў памяці. Як, адступаючы ў 44-м, немцы бамбілі чыгуначную станцыю і маці з меншымі дзяцьмі пабегла ратавацца на чыйсьці хутар, а я з бабуляй сядзела ноччу пад сцяной хлява. Як перажывалі ўсе ў хаце, калі не было вестачкі ад брата Валодзі – ён ваяваў недзе на Прусах. Ваяваў і мой, тады яшчэ будучы, муж Міхаіл Еўдакімавіч. Вярнуўся з фронту хоць кантужаны, аднак жывы. А многа ж мужчын з нашай Цецяроўкі засталіся ляжаць у нямецкай зямлі…

Алене Аляксееўне восемдзесят тры, жыве ў аграгарадку Пагранічны. У яе трое ўнукаў і двое праўнукаў. І галоўнае, чаго жадае ім бабуля – здароўя і мірнага неба над галавой.

Марыя Драпеза, 2014 год.